УДК: 94 (476)

*А.А. Савіч*

# ДЗІЦЯЧЫЯ ДАМЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ІВАЦЭВІЦКГА РАЁНА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-Х – 1950-Я ГАДЫ

Адной з вострых праблем сучаснага грамадства з’яўляецца праблема сіроцтва, у першую чаргу сацыяльнага. Апошнім часам Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе адпаведныя мерапрыемствы структурна-арганізацыйнага характару. У сістэме выхавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, значнае месца займаюць дзіцячыя дамы. Прадметам дадзенага артыкула з’яўляюцца сацыяльна-эканамічныя, вучэбна-метадычныя і арганізацыйна-кадравыя аспекты дзейнасці дзіцячых дамоў на тэрыторыі сучаснага Івацэвіцкага раёна, якія асвятляюцца на падставе архіўных матэрыялаў, што ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак Аналізуюцца і іншыя аспекты дзейнасці дзіцячых дамоў на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна ў другой палове 1940-х – 1950-я гады.

**Уводзіны**

У 1940-я – 1950-я гады тэрыторыя сучаснага Івацэвіцкага раёна была падзелена Косаўскі (з 20.09.1947 Івацэвіцкі), Быценскі, Целяханскі раёны. Найважнейшай задачай, якая стаяла перад сістэмай адукацыі савецкай дзяржавы ў пасляваены перыяд, была неабходнасць уладкавання дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Па ўсёй краіне пачалася кампанія па арганізацыі дзіцячых дамоў, што давалі прытулак дзецям. Адпаведныя мерапрыемствы ажыццяўляліся і на тэрыторыі Івацэвіччыны, дзе ў пасляваенны час функцыянавалі дзіцячыя дамы ў Быцені, Косава і Целяханах.

**Дзіцячыя дамы на тэрыторыі Івацэвіччыны як асноўная форма арганізацыі выхавання дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў**

Ажыццяўляючы мерапрыемствы па ўладкаванні дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, наладжваючы матэрыяльна-тэхнічныя і арганізацыйна-метадычныя ўмовы дзейнасці дзіцячых дамоў, абласное кіраўніцтва выстаўляла адпаведныя патрабаванні да дзейнасці іх адміністрацыі. Паводле справаздачы Брэсцкага абласнога аддзела народнай адукацыі, асноўнымі задачамі ў 1947–1948 навуковым годзе былі карэннае паляпшэнне навучання дзяцей, зніжэнне да мінімуму працэнт другагоднікаў, далейшае паляпшэнне выхаваўчай працы ў дзіцячых дамах (выхаванне маральных якасцей, культуры паводзін, культурна-гігіенічных звычак), умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, упарадкаванне ўліку маёмасці і барацьба з крадзяжамі, «разбазариванием» дзяржаўных каштоўнасцей, паляпшэнне бытавых умоў, ліквідацыя скучанасці, павышэнне агульнай культуры ў дзіцячых дамах [2, арк. 1]. Акрамя гэтага, вялікая ўвага надавалася палітычнаму, патрыятычнаму, інтэрнацыянальнаму выхаванню дзяцей.

Уладкаванне дзіцячых дамоў суправаджалася цяжкасцямі матэрыяльна-тэхнічнага характару. Шмат нараканняў і заўваг выяўлялся у ходзе неаднаразовых праверак і рэвізій, якія праводзіліся вышэйстаячымі органамі. Так, напрыклад, у загадзе Брэсцкага аблана ад 1 снежня 1948 г. былі агучаны вынікі чарговай рэвізіі, якая адбылася ў Косаўскім дзіцячым доме. Сцвярджалася, што дзіцячы дом да зімы не падрыхтаваны, рамонт памяшканняў не скончаны, поўнага запасу паліва на зіму 1948–1949 гг. Ва ўстанове вялікая скучанасць, каля 60 выхаванцаў спалі па двух на адным ложку, пры тым што выдзеленыя на рамонт і пашырэнне памяшканняў сродкі ў суме 80 тысяч рублёў не былі асвоены. Пасцельная бялізна брудная, выхаванцы абмундзіраваны кепска. У час праверкі было выяўлена, што супрацоўнікі дзіцячага дома карысталіся казённымі пасцельнымі прыналежнасцямі, інвентаром і мэбляй, атрымлівалі бясплатнае харчаванне за кошт дзяцей-сірот, якое было недастатковым па

сваёй каларыйнасці. Як вынік такога становішча, ў 1948 г. з дзіцячага дома было 32 ўцёкі. На той момант ужо былы дырэктар дзіцячага дома В.П. Заастроўскі, як адзначалася ў загадзе, сумесна з бухгалтарам сталі на шлях скрывання бюджэтных сродкаў. Яшчэ вясной, 29 красавіка 1948 г., рэвізія выявіла безгаспадарчыя адносіны да захавання гародніны, у выніку чаго згніло 24 878 кг бульбы і 300 кг агуркоў, за што дырэктар Заастроўскі атрымаў строгую вымову, хоць быў прызначаны на пасаду толькі 15 сакавіка 1948 г. [11, арк. 6–7].

Колькасць дзяцей у дзіцячых дамах не была стабільнай, частымі былі ўцёкі, пераводы ў іншыя дзіцячыя ўстановы, переезды да родзічаў. Так, на працягу 1948 г. з Косаўскага дзіцячага дома ўцяклі ажно 38 чалавек, у той самы час з Антопальскага – 8, Камянецкага – 8, з Бярозаўскага – 6, з Шарашоўскага і Маларыцкага па 4 выхаванцы [10, арк. 24]. У Косаўскім раёне за першае паўгоддзе 1947 г. было ўлічана 47 дзяцей, якія засталіся без бацькоў. З іх 29 – дзеці-сіроты, бацькі якіх загінулі ў час вайны, 46 уладкаваны ў дзіцячы дом, 1 аддадзены пад апеку. Усяго па раёне 67 дзяцей знаходзіліся на патранаце, 2 пад апекай, 180 дзяцей у Косаўскім дзіцячым доме. На 1 студзеня 1948 г. на ўліку было 76 дзяцей, якія засталіся без бацькоў, з іх 63 – дзеці, бацькі якіх загінулі, 11 уладкаваны ў дзіцячы дом, 65 узяты на патранаж роднымі ці блізкімі. У дзіцячым доме знаходзілася 220 дзяцей [1, арк. 23, 24].

У канцы 1947–1948 навучальнага года ў Косаўскім агульным школьным дзіцячым доме было 212 выхаванцаў, з іх 32 – выдатнікі вучобы, 194 здалі іспыты за навучальны год, 13 атрымалі заданне на лета і 5 пакінуты на другі год. У наступным навучальным годзе ва ўстанове было 149 навучэнцаў, з якіх 131 паспяхова вучыўся, 8 вучняў былі выдатнікамі, 18 не паспявалі па пэўных прадметах. У 1949–1950 навучальным годзе адпаведныя лічбы былі: 127, 106, 1, на другі год пакінута было 11, работу на восень атрымалі – 10 [2, арк. 6; 4, арк. 3; 10, арк. 20].

Табліца 1 – Вынікі 1954–55 навучальнага года дзіцячых дамоў Івацэвіччыны

| Дзіцячы дом | Колькасць вучняў | на выдатна скончылі | скончылі на 4–5 | скончылі на 4–3 | Усяго паспявалі | Не паспявалі | Не атэставана |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Быценскі № 1 | 82 | 1 | 14 | 62 | 77 | 4 | 1 |
| Быценскі № 2 | 80 | 19 | 22 | 35 | 76 | 4 | 1 |
| Косаўскі | 130 | 13 | 41 | 74 | 128 | 1 | 1 |
| Целяханскі | 72 | – | 5 | 58 | 63 | 9 | – |

Табліца 2 – Паспяховасць выхаванцаў дзяцячых дамоў за Івацэвіччыны 1954–55 навучальны год (з улікам асенніх экзаменаў)

| Дзіцячы дом | Колька сць вучняў | Пераведзены ў наст. клас | Атрымалі заданне на восень | Пераведзены ў наст.клас восенню | Усяго пераведзена | Пакінуты надругі год | Паспяхов асць, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Быценскі № 1 | 80 | 76 | 3 | 2 | 78 | 2 | 97,5 |
| Быценскі № 2 | 81 | 76 | 2 | – | 76 | 5 | 94 |
| Косаўскі | 127 | 126 | 1 | 1 | 127 | – | 100 |
| Целяханс кі | 76 | 89 | 6 | 5 | 74 | 2 | 97.3 |

Як відна з прыведзенай інфармацыі, лепшыя поспехі дэманстраваў Косаўскі дзіцячы дом [8, арк. 46].

Паступова паляпшаючы матэрыяльную базу і бытавыя ўмовы, Косаўскі дзіцячы дом у 1947–48 навучальным годзе набыў поўны камплект мэблі [2, арк. 2]. Дзіцячыя дамы забяспечваліся свойскай жывёлай, птушкамі, мелі зямлю. Напрыклад, у 1951 г. Косаўскі дзіцячы дом меў надзел плошчай 17 га, для вучэбных мэтаў выкарыстоўвалася 0,75 га, пад палявыя і агародныя культуры – 12,25 га, пад сенакос – 4 га, сад меў 150 пладовых дрэў і кустоў, у гаспадарцы мелася 9 кароў, 4 кані, 18 свіней, 6 авечак, была пасека з 11 пчаліных сямей [5, арк. 163].

Аднак у даведцы аб стане дзіцячых дамоў Брэсцкай вобласці на 1 сакавіка 1949 г. адзначалася, што ў Косаўскім дзіцячым доме, як і ў Бярозаўскім, Пружанскім, Шарашоўскім, «няма памяшкання для ўмывання, і выхаванцам прыходзіцца ўмывацца ў калідорах і іншых непрыстасаваных памяшканнях і з кружак, бо няма ўмывальнікаў» [10, арк. 19]. На 23 мая 1951 г. у Косаўскім дзіцячым доме была зроблена прыбудова да асноўнага будынка, што дало магчымасць забяспечыць 170 дзяцей дастатковай плошчай для вучобы і спальных памяшканняў. У гэты час забяспечанасць абмундзіраваннем і бялізнай (пасцельнай і нацельнай) была дастатковай [5, арк. 24, 26]. Дзіцячыя дамы вымушаны былі арганізоўваць вырошчванне садавіны і гародніны дзеля забеспячэння харчаваннем, пры гэтым вырашаліся выхаваўчыя задачы – дзеці далучаліся да працы. Як адзначалася ў справаздачах Брэсцкага аблана, на працягу некалькіх гадоў поўнасцю забяспечвалі сябе гароднінай, у тым ліку бульбай, Косаўскі і Быценскі дзіцячыя дамы. На грошы, атрыманыя з уласных гаспадарак, дзіцячыя дамы ажыццяўлялі рамонт, набывалі вучэбны і фізкультурны інвентар, настольныя гульні, праводзіліся экскурсіі і іншыя культурныя мерапрыемствы [8, арк. 6].

Ва ўмовах арыентацыі сістэмы адукацыі на політэхнічнае навучанне адміністрацыя прыкладала шмат намаганняў па забеспячэнні сваіх устаноў тэхнічнымі сродкамі. Напрыклад, у майстэрні Косаўскага дзіцячага дома сіламі выхаванцаў пад кіраўніцтвам інструктара быў змайстраваны электрастанок з цыркулярнай пілой і наждачным каменем, электратакарны станок па дрэве, верстакі, меліся інструменты па апрацоўцы метала. У сярэдзіне 1950-х гадоў майстэрні Косаўскага і Быценскага дзіцячых дамоў прызнаваліся найлепш абсталяванымі сярод аналагічных устаноў вобласці [9, арк. 7, 8, 10, 11].

Былі, аднак, цяжкасці і з камплектаваннем педагагічнага калектыву дзіцячых дамоў, напрыклад, вясной 1949 г. у Косаўскім дзіцячым доме не было завуча. Няпростыя задачы, якія стаялі перад калектывам Косаўскага дзіцячага дома ў 1949 г., вырашалі дырэктар установы А.Р. Мыслівец, які меў незакончаную вышэйшую адукацыю (быў прызначаны на пасаду 10 красавіка 1949 г.) [12, арк. 31], завуч М.А. Кіслянкова, выхавацелі Л.Д. Кілчэнкава, Л.В. Клушына, А.Ц. Кашкевіч, М.П. Манёнік, В.М. Гапеева, Л.П. Амельяновіч, якія мелі сярэднюю адукацыю, інструктары М.П. Шпадэла, С.С. Казлоў, Д.С. Акавіты, якія мелі пачатковую адукацыю, старшы піянерважаты С.М. Глушанкоў меў сямігадовую адукацыю. У дзетдоме працавалі ўрач В.К. Дашкевіч і медсястра А.К. Цыганкова [3, арк. 18, 24, 56].

Сетка дзіцячых дамоў па вобласці не была пастаяннай, паступова некаторыя ўстановы скасоўваліся, персанал пераводзілі ў іншыя ўстановы. Так, напрыклад, у 1955 г. быў закрыты Быценскі дзіцячы дом № 2, дырэктара Грабенкіна перавялі ў Мікашэвіцкі дзіцячы дом. У гэтым жа годзе дырэктара Целяханскага дзіцячага дома Чыкуна знялі з пасады, на яго месца быў прызначаны былы дырэктар аналагічнай установы з Драгічына Ільніцкі. Завуча з ліквідаванага Давыд-Гарадоцкага дзіцячага дома Гадовікаву перавялі ў Целяханы, завуча Быценскага № 2 Сапегіну перавялі ў Высокаўскі дзіцячы дом, а выхавацеля Рэўтаву прызначылі завучам у Шарашоўскі дзіцячы дом. На фоне частых змен дырэктараў Косаўскага дзіцячага дома сваёй прафесійнасцю вылучаўся завуч установы Мароз. У гэты час некаторыя выхавацелі

дасягнулі пэўных поспехаў у сваёй дзейнасці. Напрыклад, малады педагог-выхавацель Быценскага дзіцячага дома № 1 К.С. Журавель сумеснай, узгодненай з настаўнікам Сялецкай школы В.А. Сінкевічам працай на працягу некалькіх гадоў дасягнула 100 % паспяховасці сваіх вучняў. Пры гэтым ажыццяўлялася сістэматычнае наведванне дзіцячага дома і школы, індывідуальная праца са слабымі вучнямі, практыкавалася глыбокае вывучэнне індывідуальных асаблівасцей дзяцей, сумеснае правядзенне сходаў. Паспяхова працавала і выхавацель Косаўскага дзіцячага дома Гурко, якая на працягу чатырох гадоў дасягала поўнай паспяховасці выхаванцаў, якія пры гэтым мелі трывалыя веды: з 36 вучняў 4 класа 3 скончылі вучэбны год «на выдатна», 17 «на добра і выдатна» (60%) [8, арк. 7, 8, 10, 11]. Вызначаліся сваёй стараннасцю выхавацелі Каранеўская і Усовіч (Косаўскі), а таксама Шышкіна (Быценскі). Дырэктар Быценскага дзіцячага дома характаразаваўся як кіраўнік, які ўнікае ў вучэбна-выхаваўчы працэс [9, арк 16–18].

У пачатку 1950-х гадоў у дзіцячых дамах значна палепшылася метадычная праца педагагічных саветаў і метадычных нарад. Палепшыўся кантроль з боку дырэктараў і завучаў дзіцячых дамоў. Пры гэтым належнае месца заняло правядзенне сумесных педсаветаў дзіцячых дамоў і школ, у якіх вучыліся выхаванцы дзетдамоў. Разам з гэтым у дзейнасці кіраўніцтва Косаўскага дзіцячага дома былі выкрыты сур’ёзныя недахопы, якія тлумачыліся кепскай арганізацыяй кіраўніцтва з боку дырэктара дзетдома. За прымяненне антыпедагагічных мер уздзеяння на дзяцей, за сістэматычнае п’янства, «очковтирательство» дырэктар установы Мыслівец быў зняты з пасады [5, арк. 13, 15, 17]. Неаднойчы падвяргаліся крытыцы іншыя асобы, якія працавалі на пасадах у дзіцячых дамах. Напрыклад, наступны дырэктар Косаўскага дзіцячага дома Ермакоў падвяргаўся крытыцы за недастатковае засваенне зместу работы ўстановы, адсутнасць належнай цікавасці да пытанняў вучэбна-выхаваўчага характару, «амаральныя ўчынкі ў асабістых паводзінах». Трэба адзначыць, што крытыка мела вынік: у справаздачах пазнейшага часу Ермакоў характарызаваўся станоўча, разам з завучам Мароз ажыццяўляў выхаваўчую працу з цяжкімі падлеткамі, наведваў школу, правяраў вучобу і паводзіў, праводзілі гутаркі з вучнямі і настаўнікамі [6, арк. 11; 7, арк. 31]. Пастуnова ўмацоўваліся педагагічныя калектывы дзіцячых дамоў. Так, у пачатку 1950-х гадоў многія выхавацелі дэманстравалі добрыя вынікі працы і станоўча характарызаваліся кіраўніцтвам. У 1951–52 навучальным годзе выхавацелі Косаўскага дзіцячага дома Гурко, Кільчэнкава і Юшкевіч дасягнулі поўнай паспяховасці ў вучобе вучняў сваіх груп. Сярод выхавацеляў выдзяляліся Клушына і Юшкевіч, якія працавалі ў дзетдоме з 1946 г., добра ведалі сваю справу, забяспечвалі высокую паспяховасць выхаванцаў, шмат працавалі над павышэннем сваёй педагагічнай кваліфікацыі, вучыліся ў Брэсцкім настаўніцкім інстытуце [6, арк. 13, 15, 16].

У гэты час дзіцячыя дамы былі ахоплены небяспечнай хваробай трахомай, якая пачала набываць памеры эпідэміі. Напрыклад, у Косаўскім дзіцячым доме «ў выніку кепскага медыцынскага нагляду і адсутнасці старанных і глыбокіх медаглядаў мелася 32 выпадкі трахомы, верагодна, з-за гэтага і рэзка знізілася паспяховасць: са 163 вучняў не паспявала 26. У 1951 г. па Брэсцкай вобласці было выяўлена 66 хворых на трахому, пры гэтым 47 хворых было ў Косаўскім дзіцячым доме. Масавая ўспышка трахомы ў гэтым годзе тлумачылася няправільнай дыягностыкай з боку абласнога ўрача-акуліста Абросімава, які неаднаразова праводзіў у Косаўскім дзіцячым доме агляд дзяцей, але адмаўляў наяўнасць трахомы. Брэсцкаі аблана вымушаны быў арганізаваць трахаматозны ізалятар пры Косаўскім дзіцячым доме. Аднак лячэнне ажыццяўлялася такім чынам, што колькасць хворых не памяншалася, а павялічылася да 77. Неэфектыўнасць лячэння трахомы тлумачылася тым, што Брэсцкі аблздраў не замацаваў пастаяннага ўрача для ізалятара, а ўсталяваў сістэму адкамандзіравання

ўрачоў у Косаўскі дзіцячы дом на 1 месяц па чарзе, тым самым «обезличил». Характэрным было тое, што розныя ўрачы па-рознаму вызначалі ступень захворвання. Па распараджэнні Міністэрства асветы БССР 24 выхаванцы Косаўскага дзіцячага дома з найгоршым станам вачэй былі накіраваны ў трахаматозны дзіцячы дом Баранавіцкай вобласці. Аднак камісія, створаная Баранавіцкім аблздраўаддзелам, вызнала ўсіх здаровымі, і дзеці былі адпраўлены назад. Вызваная для канчатковай кансультацыі камісіся Міністэрства аховы здароўя, якую ўзначальваў прафесар Бірыч, прызнала дзетак хворымі на трахому.

Пасля такога здарэння ў дзіцячых дамах былі зроблены прафілактычныя прышчэпкі, у тым ліку ад воспы, дыфтэрыі і інш. Была ўпарадкавана медыцынская дакументацыя, больш рэгулярнымі сталі медыцынскія агляды дзяцей. Былі створаны ізалятары, пабудаваны лазні [5, арк. 88, 93, 148–149].

Савецкая дзяржава выказвала клопат аб выхаванцах дзіцячых дамоў, імкнулася стварыць умовы для іх агульнаадукацыйнай і прафесійнай падрыхтоўкі. Напрыклад, загадам міністра вышэйшай адукацыі СССР ад 15 сакавіка 1949 г. «Аб матэрыяльным забеспячэнні выхаванцаў дзіцячых дамоў, якія навучаюцца ў вышэйшых і сярэдне-спецыяльных установах (тэхнікумах)» дырэктарам сярэдніх спецыяльных устаноў (тэхнікумаў) прадпісвалася залічваць выхаванцаў дзіцячых дамоў, якія выдатна скончылі сямігадовыя школы, і ўтрымліваць на поўным дзяржаўным забеспячэнні да заканчэння ўстановы. Пры гэтым усталёўваўся наступны парадак: выхаванец пражывае ў дзіцячым доме і знаходзіцца на яго поўным забеспячэнні ў тым выпадку, калі тэхнікум, у якім ён вучыцца, знаходзіцца ў адным з дзіцячым домам горадзе. Калі ж у горадзе не было адпаведнай установы, то выхаванца дзіцячага дома маглі залічыць у тэхнікум у іншым горадзе, пры наяўнасці ў ім інтэрната для навучэнцаў. Установы, якія прымалі выхаванцаў дзіцячых дамоў, абавязаны былі пасяліць іх у інтэрнаце і ўтрымліваць на поўным дзяржаўным забеспячэнні па нормах дзіцячых дамоў [10, арк. 30].

Аднак большасць выхаванцаў дзіцячых дамоў пасля дасягнення сталага ўзросту накіроўвалася ў рамонтныя і фабрычна-заводскія вучылішчы, пасля чаго працавала на прадпрыемствах СССР. Напрыклад, выпускнікі Косаўскага дзіцячага дома ў 1954-1955 гг. паступілі ў калінінградскія, рыжскія, брэсцкія, молатаўскія рамесныя вучылішчы і паспяхова авалодвалі прафесійным майстэрствам [8, арк. 19].

**Заключэнне**

Такім чынам, у пасляваенныя гады органы савецкай улады вырашэнне праблемы догляду і выхавання дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, бачылі ў арганізацыі дзіцячых дамоў. Былі рэдкія выпадкі, калі дзеці перадаваліся пад апеку родным ці блізкім. Такое становішча можна патлумачыць тым, што ўлады не былі ўпэўнены ў добранадзейнасці мясцовага насельніцтва, асноўную масу якога першапачаткова, да ажыццяўлення калектывізацыі, складалі сяляне-аднаасобнікі, якія не праяўлялі вялікай цікавасці да будаўніцтва сацыялістычнага калгасна-саўгаснага жыцця. Таму дзяржава давярала выхаванне дзяцей гэтай катэгорыі дзяржаўным установам – дзіцячым дамам, якія павінны былі праводзіць арганізацыйна-выхаваўчую працу у камуністычным духу. Уладкаванне дзіцячых дамоў суправаджалася цяжкасцямі матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйна-кадравага характару. Адсутнасць прыстасаваных памяшканняў, кепскія санітарна-гігіенічныя ўмовы, перанаселенасць, цяжкасці з харчаваннем, забеспячэннем бялізнай, вопраткай былі пастаяннымі спадарожнікамі жыцця дзіцячых дамоў, становішча ў якіх ускладнялася адсутнасцю падрыхтаваных кваліфікаваных адміністратыўна-педагагічных кадраў. Частымі былі выпадкі нядбайных паводзін адміністрацыі і супрацоўнікаў, якія на сабе адчувалі цяжкасці сацыяльна-бытавога характару пасляваеннага жыцця. Паступова ў выніку мэтанакіраванай арганізацыйна-

кадравай палітыкі, паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы дзіцячыя дамы Івацэвіччыны пазбаўляліся ад названых недахопаў. Аднак сёння гаварыць аб дзіцячых дамах як аб адзіным выйсці ў вырашэнні праблемы сіроцтва, у тым ліку на падставе вопыту функцыянавання дзіцячых дамоў Івацэвіччыны ў акрэслены час, не прыходзіцца. Толькі ва ўмовах сям'і магчыма стварыць умовы для таго, каб дзеці адчувалі клопат і пяшчоту, атрымлівалі паўнавартаснае, збалансаванае выхаванне. Таму сучасная палітыка Рэспублікі Беларусь па вырашэнні сацыяльна-выхаваўчых праблем дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, накіравана на перадачу гэтых функцый ад дзяржаўных устаноў сем'ям – стварэнне дзіцячых дамоў сямейнага тыпу.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Отчет об устройстве детей, оставшихся без родителей, органами народного образования Брестской области за 1947–1948 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 30.
2. Отчет о работе детских домов Брестской области за 1947–1948 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп.. 1. – Спр. 26.
3. Отчет о работе детских домов Брестской области за 1948–1949 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 39а.
4. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1949–1950 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 56.
5. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1950–1951 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 73.
6. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1951–1952 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 92.
7. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1952–1953 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 110.
8. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1954–1955 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 154.
9. Отчет по итогам работы детских домов Брестской области за 1954–1955 учебный год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 173.
10. Отчеты о состоянии воспитательной работы и хозяйственно-бытовом обслуживании детей в детских домах и детских садах // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 47.
11. Приказы заведующего Брестским областным отделом народного образования за 1948 год // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 37.
12. Решения Брестского областного исполнительного комитета совета депутатов трудящихся // ДзАБВ. – Фонд. 1041. – Воп. 1. – Спр. 46.

***Savich A.A.*** **The Children's Homes in Ivatsevichy District in the Late 1940s–1950s.**

The problem of orphanhood in one of the sharpest problems of modern society, especially the problem of social orphanhood. Today The Republic of Belarus undertakes proper measures of structurally organizational character, which are aimed at expanding the range of children's homes of domestic type. However a considerable part is played by children's homes in educating children-orphans and children who remained without parental care. The article deals with socio-economic, educational, organizational and staff aspects of activity of children's homes in modern Ivatsevichy district, which are described on the basis of the archived materials and are first introduced in scientific usage. It also analyses other aspects of children's homes in Ivatsevichy district in the late 1940s–1950s.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.04.2010